# ВЫВУЧЭННЕ ЭПІЧНАГА ТВОРА Ў ШКОЛЬНЫМ КУРСЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ
# THE STUDY OF EPIC WORK IN A SCHOOL COURSE OF BELARUSIAN LITERATURE

Рашэтнікава Ніна Барысаўна
Мінск, Рэспубліка Беларусь

Ключевые слова: эпос, эпическое произведение, белорусская литература, изучение белорусской литературы.

Резюме. Рассматриваются основные принципы и подходы к изучению эпического произведения в школьном курсе белорусской литературы. Внимание обращено на процесс формирования у учащихся средних и старших классов читательских умений. Указывается на перспективность приемов анализа эпического произведения в 5 классе. Анализируется изучение трилогии Якуба Коласа «На росстанях» в старших классах.

Keywords: epic, epic, Belarusian literature, the study of Belarusian literature.

Summary. The basic principles and approaches to the study of epic work in a school course of Belarusian literature. The attention paid to the process of formation at students in secondary and high school readers' skills. It points to the promising methods of analysis of epic product in the 5th grade. Study analyzes the trilogy of Yakub Kolas "At the Crossroads" in high school.

У аснове школьнага аналізу эпічнага твора ляжаць тыя ж прынцыпы і падыходы, што і пры вывучэнні іншых радоў, але ёсць тут свае асаблівасці, што, безумоўна, уплывае на методыку работы над творам на ўроках літаратуры.

“Славесна-мастацкія творы здаўна прынята аб’ядноўваць у тры вялікія групы, што называюцца літаратурнымі родамі. Гэта эпас, драма і лірыка. Хоць і не ўсё створанае пісьменнікам (асабліва ў XX ст.) укладваецца ў гэту трыаду, яна і сёння захоўвае сваю значнасць і аўтарытэтнасць у складзе літаратуразнаўства” [5, с. 294].

Блізкім, але не тоесным да паняцця “эпас” з’яўляецца паняцце “эпічнасці”. Эпічнасць — нетаропкае сузіранне жыцця ва ўсёй яго складанасці, шматпланавасці, шырыні погляду на свет. А гэта значыць, што эпічнасць як ідэйна-эмацыянальная настроенасць мае месца ў эпасе, і ў лірыцы, і ў драме. Эпас, лірыка і драма не прывязаны да эпічнасці, лірызму або драматызму.

Для эпасу, як вядома, характэрнымі з’яўляюцца тры цэнтры ўвагі: на падзеі, на герояў твора і аўтара твора. Наяўнасць сюжэту, прысутнасць занятых у дзеянні асоб — характэрныя адзінкі эпічнага твора.

Шырокі дыяпазон мастацкіх сродкаў у эпічным творы з’яўляецца прычынай, чаму эпічныя творы не маюць абмежаванняў у аб’ёме тэксту.

Апавяданне — арганізуючы пачатак у эпічным творы, для яго характэрна дыстанцыя ў часе: апавяданне вядзецца часта збоку і мае форму мінулага часу.

Да эпічных жанраў адносяцца казка, прыпавесць, паданне, легенда, навэла, апавяданне, нарыс, эсэ, аповесць, раман, эпапея і інш. Эпічныя творы могуць мець як празаічную, так і вершаваную форму. Адсюль ліра-эпічныя творы: байка, балада, паэма. У літаратуразнаўстве прынята адносіць жанры эпасу да буйных, сярэдніх і малых форм.

Нягледзячы на тое, што ў літаратуразнаўстве не спыняюцца спрэчкі пра асаблівасці жанраў, у метадычных працах увага звяртаецца толькі на тыя дэфініцыі, што ўстаяліся.

У школьным курсе беларускай літаратуры эпічныя творы вывучаюцца з пятага па адзінаццаты клас, адсюль неабходнасць ставіць пытанне пра паступовае і бесперапыннае фарміраванне чытацкіх уменняў у працэсе аналізу мастацкага твора. Зместам навучання павінны быць спосабы сумеснай дзейнасці вучняў і настаўніка.

Чытацкія ўменні вызначаны ў вучэбнай праграме, і пры завяршэнні навучальнага года можна падвесці вынікі, паказаць, наколькі паспяховым быў адукацыйны працэс. Настаўнік-славеснік — творца сваёй методыкі выкладання літаратуры — разумее, што неабходна было ўнесці пэўныя змены ў пералік вызначаных у праграме ўменняў, канкрэтызаваць іх.

У пятым класе пры вывучэнні эпічнага твора цэнтральным уменнем аналітычнага характару з’яўляецца, на наш погляд, уменне вызначаць прычынна-выніковыя сувязі ў творы, разумець своеасаблівасць сюжэту ў творы.

Працэс фарміравання ўменняў праходзіць некалькі этапаў або стадый: першапачатковае азнаямленне з матэрыялам (мастацкім тэкстам), яго асэнсаванне, спецыяльная работа па яго замацаванню, авалоданне матэрыялам, значыцца ёсць магчымасць аперыраваць ім у розных умовах, прымяняць яго на практыцы.

Паспяховае фарміраванне ўменняў залежыць не толькі ад назапашаных ведаў, але і ад авалодання разумовымі аперацыямі, добра адпрацаванымі і замацаванымі прыёмамі. У метадычнай літаратуры знаходзім наступную паслядоўнасць крокаў, скіраваных на засваенне вучнямі 5 класа вызначаных спосабаў дзейнасці:

- пераказаць твор, вылучыўшы асноўнае пытанне, на якое адказвае сюжэт;
- адказаць на пытанне: што (хто) “перашкаджае” і што (хто) “дапамагае” здзяйсненню апошняй падзеі;
- адказаць на пытанне: як і дзякуючы чаму пераадольваюцца перашкоды на шляху да здзяйснення апошняй падзеі [4, с. 23].

Як бачым, падкрэсліваецца неабходнасць працаваць над эпічным творам па зададзенаму стэрэатыпу: пераказ абавязкова пачынаем з канца. Падобны парадаксальны пачатак работы над эпічным творам выклікае ў

школьнікаў цікавасць, а паспяховасць у працы пераконвае іх у тым, што такі спосаб работы прыводзіць да жаданых вынікаў. "На самай справе, каб убачыць невыпадковыя сувязі, логіку падзей, патрэбна паглядзець, чым "гэта ўсё" заканчваецца. Тады стане зразумелым, як да гэтага "ўсё ішло" [4, с. 23-24].

Такім чынам вучні могуць спасцігаць сутнасць сюжэта, паступова пачынаць разумець значэнне канфлікту ў эпічным творы. "Словы "завязка" і "развязка" звяртаюць увагу на тое, што ўдзельнікі канфлікту завязваюцца ў вузлы супярэчнасцяў і што гэтыя "вузлы" імкнуцца да развязкі. Аднак развязаць іх звычайна не ўдаецца — толькі разрубіць. Эпізод, дзе канфлікт дасягае кропкі найвышэйшага напружання і пасля якога хутка пачынаецца развязка — гэта кульмінацыя. Карыстаючыся нашым алгарытмам, мы вызначаем кульмінацыю як эпізод, дзе асноўнае пытанне сюжэта атрымлівае адказ [4, с. 24].

Апісаны падыход да аналізу эпічнага твора ў 5 класе, безумоўна, не адзіны, існуюць розныя варыянты фарміравання чытацкіх уменняў, асаблівасць апісанай методыкі работы ў класе ў тым, што яна нескладаная.

Паслядоўнасць вывучэння эпічнага твора дастаткова дакладна апісана ў метадычных працах і засвоена практыкай навучання.

Работа над эпічным творам традыцыйна распачынаецца з вызначэння педагагічнай канцэпцыі.

Як вядома, педагагічная канцэпцыя аналізу мастацкага твора на ўроках літаратуры — гэта ўсведамленне настаўнікам-славеснікам мэт і задач вывучэння твора, разуменне ім маральна-эстэтычнага ўздзеяння ідэйна-мастацкага зместу дадзенага твора на канкрэтных вучняў. "Педагагічная канцэпцыя дазваляе весці вывучэнне твора "прыцэльна". Таму педагагічная канцэпцыя аналізу не можа быць абслютна нязменнай. Час і кантынгент уносяць у яе свае карэктывы. Такім чынам, педагагічная канцэпцыя ўбірае ў сябе, ператварае ў канкрэтную методыку ўсе рады педагагічных ідэй: агульнапедагагічнага парадку (мэта навучання, адзінства пазнавальнай, выхаваўчай, развіваючай функцый), агульнаметадычныя заканамернасці (фарміраванне патрэбнасці ў чытанні, суадносіны крыніц ведаў), прыватна-метадычныя рашэнні (спецыфіка вывучэння дадзенага жанру) і, безумоўна, канкрэтна-метадычным рашэнні [2, с. 15-16].

Важна, каб пры вызначэнні педагагічнай канцэпцыі былі скарыстаны дасягненні літаратуразнаўчай і педагагічнай навукі, каб не знік пісьменнік, які апавядае ў творы пра сваё разуменне чалавека, свету, выказвае свае думкі. Так, у трылогіі "На ростанях" Якуб Колас стварыў вобраз чалавека актыўнай жыццёвай і грамадзянскай пазіцыі. У гэтым вобразе знайшлі праўдзівае адлюстраванне шматлікія хвалюючыя грамадскасць пытанні часу, філасофскія, маральна-этычныя погляды самога Якуба Коласа на свет і прызначэнне чалавека.

Работа над трылогіяй "На ростанях" на ўроках беларускай літаратуры — добры матэрыял для фарміравання ў школьнікаў чытацкіх уменняў.

Настаўнік можа забяспечыць вучняў тэкстамі для самастойнай работы, арганізаваць і праверыць выкананне заданняў. Адзін з асноўных аспектаў — што і з якой мэтай адлюстроўвае ў творы Якуб Колас. На ўступным уроку ў сістэме работы над раманам педагог мае магчымасць скіраваць роздумы школьнікаў над праблематыкай твора, на праблему свядома-гераічнай асобы ўзнятую ў трылогіі “На ростанях” на асаблівую вышыню, пісьменнік праз маральна-этычную праблематыку імкнецца правесці думку, што вобраз галоўнага героя — гэта лепшае ў чалавеку, адсюль багатае духоўнае жыццё Андрэя Лабановіча, яго роздумы пра чалавека і свет. “Настаўнік перанёс лямпу ў другі, яшчэ меншы, пакоік, дзе стаяў яго просценькі дзервяны ложак, лёг у пасцелю і чытаў “Зорныя светы і іх насельнікі”.

Шырокі малюнак недасяжных светаў раскрываўся перад вачамі маладога настаўніка ва ўсёй сваёй тоеснасці і бязмежнасці. І чым больш мысль захаплівалася гэтым чароўным малюнкам і гэтымі незлічонымі светамі, раскіданымі сярод бяздонных багнаў, такіх страшных, такіх павабных, — зямля і чалавек, пагардлівы гаспадар яе, рабіліся ўсё меней і меней значнымі, нікчэмнымі. Гэта бязмежнасць зацірала зямлю, і яна гублялася ў ёй, як малюсенькая пылінка. А якім малазначным, непрыкметным з’яўляўся чалавек, яго клопат, яго штодзённыя драбніцы жыцця [3, с. 13].

Падчас працы над праблематыкай твора школьнікі павінны адчуць, зразумець, убачыць “карэнні з’яў”, тое, што стаіць за словамі і ўчынкамі вобразаў-персанажаў.

Стратэгія аналізу эпічных твораў буйной формы зразумела кожнаму настаўніку літаратуры, таму што ў практыцы школьнага выкладання немагчыма імкнуцца да паўнаты, вычэрпальнасці аналізу. У практыцы работы адно або некалькі пытанняў вылучаюцца як асноўныя, цэнтральныя для падрабязнага разгляду, а іншыя вывучаюцца абагульнена-аглядна, у межах адведзенага для вывучэння на ўроках літаратуры часу. Як падкрэслівала М. А. Рыбнікава: “Метадычныя прыёмы дыктуюцца прыродай твора… Маленькае апавяданне чытаецца і разбіраецца ў поўным аб’ёме. З рамана мы выбіраем асобныя, вядучыя раздзелы і адзін з іх чытаем у класе, другі дома, трэці ўважліва разбіраем і пераказваем блізка да тэксту, чацвёрты, пяты, шосты разбіраем у больш хуткім тэмпе і пераказваем сцісла, урыўкі з сёмага і восьмага раздзелаў даюцца ў форме мастацкага аповеду асобнымі вучнямі, эпілог апавядае класу сам настаўнік. Загадка адгадваецца і паўтараецца на памяць, прымаўка тлумачыцца і суправаджаецца жыццёвымі прыкладамі, байка разбіраецца ў разліку на ўсведамленне выражанай у ёй маралі” [1, с. 137].

Для таго каб школьны аналіз мастацкага твора стаў крыніцай духоўнага ўзбагачэння школьнікаў, пажадана весці яго “у зоне найбліжэйшага развіцця” тых вучняў, што знаходзяцца ў класе, што ні ў якім разе не адмаўляе правіла — не абмяжоўвацца сённяшнім узроўнем развіцця школьнікаў, а ўзбагачаць і развіваць іх на ўроках літаратуры.

Вернемся да пачатку вывучэння трылогіі Якуба Коласа “На ростанях” у старшых класах, дзе твор разглядаецца ў кантэксце творчасці пісьменніка і айчыннага літаратурнага працэсу. Для вучняў уступны ўрок у сістэме работы быў пачаткам аналізу рамана. Яны ўзнавілі ў сваёй уяве некаторыя эпізоды, абмеркавалі ўчынкі герояў, што ўразілі пры першым азнаямленні з творам, задумаліся над некаторымі істотнымі пытаннямі, што звязаны з асэнсаваннем прачытанага, паспрабавалі знайсці на іх адказ.

Задача наступных урокаў у тым, каб садзейнічаць больш шырокаму ўспрыманню вучнямі трылогіі “На ростанях”, іх роздуму над тымі складанымі праблемамі, што пастаўлены пісьменнікам. Гэта і канкрэтна-гістарычныя і агульначалавечыя праблемы. Галоўны герой паказаны Якубам Коласам канкрэтна-гістарычна, з усімі памылкамі, характэрнымі для прагрэсіўнай беларускай інтэлігенцыі ў пачатку XX стагоддзя. Аднак пошукі сэнсу жыцця героем, яго гарачае імкненне прынесці Айчыне карысць, яго грамадзянская пазіцыя робяць яго блізкім і зразумелым маладому чытачу, а трылогію “На ростанях” актуальнай і сёння. Маральныя, сацыяльныя, філасофскія праблемы перажыты, выпакутаваны героямі Якуба Коласа і самім аўтарам, і вучню-чытачу патрэбна ўнікнуць ў мастацкі свет пісьменніка, каб зразумець гэтыя праблемы ва ўсёй вастрыні іх пастаноўкі.

Адзін з заключных урыўкаў лічым неабходным прысвяціць лекцыі-гутарцы “Мастацкая своеасаблівасць трылогіі “На ростанях”, дзе школьнікі сваімі прыкладамі з тэксту твора падцвердзяць аповед настаўніка. Пажадана, каб прыканцы вывучэння твора настаўнік, падводзячы вынікі, сказаў пра тое, што засталося за межамі ўрокаў, пра пытанні, што не закранулі ў аналізе, з якіх пазіцый можна яшчэ паглядзець на твор, да чаго можна цяпер вярнуцца, якія пытанні можна ўзняць праз некалькі гадоў, калі з’явіцца новы жыццёвы вопыт.

Папярэдняе вызначэнне тэкставага матэрыялу для аналізу ў класе важна для фарміравання чытацкіх уменняў. Пры складанні “плану тэксту” па першай кнізе трылогіі вылучаем наступныя “апорныя” эпізоды: знаёмства Андрэя Лабановіча з Хатовіцкай інтэлігенцыяй; спрэчка Лабановіча з Максімам Турсевічам пра сэнс жыцця; работа Андрэя Лабановіча ў школе; эпізоды, што звязаны з асветніцкай дзейнасцю Лабановіча; каханне Лабановіча да Ядвісі. Аналіз гэтых эпізодаў дазваляе ўвесці вучняў у творчую лабараторыю пісьменніка.

На першым этапе вывучэння рамана ў класе асаблівая роля належыць калектыўнай рабоце школьнікаў над вылучанымі эпізодамі. Падчас калектыўнай работы над праблемамі, што пастаўлены на ўроку, вучні авалодваюць уменнем разумець сутнасць праблемы, абгрунтоўваць свае высновы фактамі, удакладняць значэнне паняццяў, якімі карыстаюцца. Калектыўная работа школьнікаў на ўроку скіравана на фарміраванне ў іх чытацкіх уменняў у працэсе вывучэння вялікага эпічнага твора.

З кожным урокам ступень цяжкасці заданняў павялічваецца, расце і ступень самастойнасці вучняў у вырашэнні пазнавальных задач.

У працэсе фарміравання ў школьнікаў чытацкіх уменняў значная роля належыць групавой форме работы. Асабліва прадуктыўнай з'яўляецца такая форма, на наш погляд, у рабоце над апераджальнымі заданнямі. Сутнасць апераджальных заданняў у тым, каб правесці назіранні вучняў над тэкстам, іх ацэнкі прачытанага ў сістэму, зрабіць работу мэтанакіраванай. З гэтай мэтай клас падзяляецца на групы, і кожная група атрымлівае вызначанае заданне. Заданне — гэта напісанне даклада на тэму.

Можна прапанаваць школьнікам наступныя тэмы:

1. Народ у трылогіі Якуба Коласа.
2. Чалавек і прырода ў рамане.
3. Шляхі інтэлігенцыі ў трылогіі "На ростанях".
4. Матыў шляхоў-дарог у рамане.

Падчас напісання пісьмовай работы вучні раяцца адзін з адным. Работа ў групе актывізуе дзейнасць кожнага школьніка. Вынікі работы будуць абмеркаваны на заключным уроку.

Асаблівае месца ў працэсе аналізу мастацкага твора займаюць уменні эстэтычнага характару. Працэс іх фарміравання складаны, і само ўключэнне ў аналіз пытанняў, што звязана з мастацкай прыродай твора, недастаткова, а толькі з'яўляецца базай для іх фарміравання. Асаблівую ўвагу пажадана звярнуць на фарміраванне тэарэтыка-літаратурных паняццяў, што служыць для школьнікаў неабходным інструментарыем.

Лічым неабходным звярнуць увагу і на ролю настаўніка-славесніка, які ўмее рэальна перадаць назапашаныя чалавецтвам і адлюстраваныя ў прыгожым пісьменстве жыццёвыя каштоўнасці школьнікам, развіваць вучняў, стымуляваць іх пазнавальную дзейнасць.

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Богданова О.Ю. Методика преподавания литературы. М., 1999.

2. Браже Т.Г. Проблемы изучения литературы в 9 классе вечерней школы. М., 1986.

3. Колас Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 13. Трылогія "На ростанях". Кніга першая і другая. Мінск, 2011.

4. Мирзоян М.А. Технология изучения эпического произведения, деятельностный подход к изучению литературы в V классе // Русская словесность. №8. 2007.

5. Хализев В.Е. Теория литературы. М., 1999.